*Аляксей Галаскок*



ГАЛАСКОК АЛЯКСЕЙ (6.06.1949, в.Талалайкі Зэльвенскага р-на). Паэт, гумарыст. Аўтар зборніка вершаў *“У жыцці для мяне ўсё не проста”, “Не шкадуюць мяне мае вершы”, “Я шчаслівы”*, кнігі для дзяцей *“Суд над сарокай”*. Сябра Саюза Беларускіх Пісьменнікаў. Падпалкоўнік запасу. Жыве ў Ганцавічах.



*З вядром пустым не пераходзь дарогу,*
*Чужыя грошы доўга не трымай,*
*Ніколі не кляніся Богу,*
*Нялюбых у жыцці не абдымай.*
***Аляксей Галаскок***

* * *

Беларусь мая, родная, мілая,
Да цябе я заўсёды ляцеў
Птушкай стомленай з выраю,
Шляхам тым, што ідзе карацей.

Не магу наглядзецца ў азёры -
І дзівоснай вады глыбіню,
І вачамі мне не абмераць
Над маёй галавой вышыню.

Не магу я паветрам надыхацца,
Калі раптам распусціцца бэз.
Ручаёвай вадою спатоліцца,
Што бяжыць праз засмужаны лес.

Не магу абысці ўсе палеткі,
Павітаць усе гаі і бары,
Не магу надзівіцца на кветкі,
На аблокаў блакіт у гары.

У жыцці гэтым многа не змерана -
Нават думкай не ўсё зразумець.
Будзе жыць Беларусь мая, веру я,
Будзе садам вясновым квітнець.

## Пра Начу

Салавей аж заходзіцца ў плачы,
Агарнуў сваім сумам раку.
Каля вёсачкі добрае Начы
Ён гаруе адзін у лазняку.

Я каханне сваё там сустрэў,

Маю мару з вачамі сінімі.
Не сумуй, а спявай, салавей,
Кліч сваю салаўіху мілую.

Радавод свой вядуць тут буслы,
Гнёзды-хаты звілі над магілкамі -
У напамін нам, каб ведалі мы,
Што жывём на зямлі хвілінкамі.

Трэба кожны пакінуў каб знак
Пры дарозе - хто крыжам, а хто і будынкамі,
Як пакінуў стары дзед Будчак
Сваю хату і плот з малюнкамі.

Ад мяне застанецца хай груша
І на ёй будзе многа галля,
Дзякуй родная вёсачка Нача,
Хоць за тое, што жыў тут і я.

* * *

Каб мне пражыць яшчэ гадоў хоць дваццаць,
Пагойдаць унукаў цёплым днём,
У бацькоўску хату завітацца
Бадзёрым крокам, нават і з кійком.

Перад смерцю абысці магілы
Сваіх родных, блізкіх і сяброў,
Каб яны мне брамку адчынілі
На той свет, як быццам бы дамоў.

Каб паспеў я папрасіць у Бога
Мне грахі зямныя адпусціць.

Ведаю, грахоў было за многа -
Па-другому не ўмеў я жыць.

**Талалайкі**

Просіць сэрца, цягне ў Талалайкі,
Дзе першы раз убачыў свет.
Там я пачуў бабуліныя байкі
І нада мною жартаваў мой дзед.

Малая вёска, але што за людзі!
Запыніць кожны, хто цябе спаткаў,
Пытаюцца: «Пятроў мо будзеш?
Падобны вельмі — як намаляваў!

Ну, што, пазнаў ты тую крушню,
Дзе у збанок збіраў ажыны?
А дзедаву не знойдзеш кузню —
Знікла й яна. Як дзед твой згінуў.

Ну, як там маці? Ці жанаты?
Адкуль ты жонку сабе ўзяў?
Як птушак, цягне ўсіх дахаты!
Вось дзякуй Богу, нас застаў!

Пабач, Алёша. Адыходзяць людзі
Ў той свет далёка, да сваіх бацькоў.
Нас не шкадуй — усе там будзем,
Бо пойдзем мы з гасцей дамоў...»

Шкада, што адміраюць Талалайкі
Няма ўжо добрых тых людзей...
Мне сорамна: не захаваў я байкі
Бабуліныя — для сваіх дзяцей.

* * *

Жыццё маё, здаецца, не пражыта:
Звіняць яшчэ на ніве каласкі.
Не разумею я, чаму ж у жыта
Хаваюцца так сціпла  васількі?

Мая краіна! Богам даравана...
Здаўна тут людзі добрыя жывуць.
І небам васількі пафарбаваныя
На дыванах сваіх дзяўчаты ткуць.

Хай каласіцца на палетках жыта,
Хай слуцкі пояс мкнецца праз вякі,
А для мяне мой скарб набыты —
Маёй радзімы ў жыце васількі.

* * *

Старэю... Цягне на магілкі.
Раней туды баяўся я хадзіць,
А зараз забягаю на хвілінку,
Каб з бацькам тут пагаварыць.

Старэю я... А бацька не старэе,
З журботай з помніка глядзіць.
Адзін другога мы ўжо не сагрэем.
Я гавару яму, а ён — маўчыць.

Кажу яму пра ўсё на свеце
(А можа, мае словы далятуць):
Як мы жывём, якія нашы дзеці,
Пра праўнукаў, што па зямлі  ідуць.

Я ведаю: мне бацька не зайздросціць,
Бо ён пажыў, а я яшчэ жыву,
Пакуль хаджу я на магілкі ў госці.
Пакуль у госці я яшчэ хаджу...

* * *

Без бацькоў паміраюць хаты,
Стрэхі хіляцца да зямлі,
А на стрэхах крычаць цыбатыя
Немым голасам каміны.

Без бацькоў памірае сад -
Плачуць дрэвы празрыстым бурштынам.
Я так сталася, што назад
Не паклікала сэрца сына.

Колькі бацька здароўя аддаў,
Будаваўшы з бярвенняў хату.
Ён да самае смерці чакаў
Родных дзетак — сваіх буслянятаў.

Кожны вечар ля плота стаяў,
Сумаваў, пазіраў на гасцінец
І душою і сэрцам чакаў.
Ён чакаў хоць малодшага сына.

* * *

Каб родны бацька мой вярнуўся,
То перад бацькам на калені б стаў.
Бо да яго жывога, не звярнуўся,
Ні разу я ў яго не запытаў:

Адкуль мы родам, дзе карэнні,
Чаму такое прозвішча маё,
Чаму ў далоні я лаўлю праменні,
Каб імі саграваць сваё жыццё?

Мой прашчур быў, здаецца, небагаты,
Бо ён збіраў з бяроз у лесе сок.
А хто прынёс да нашай хаты
Мянушку  гэту - Галаскок?

Дапамажы мне, бацька, добрым словам,
Парай, як жыць сярод  людзей,
Каб не стаміцца, не шукаць мне знову
Паветра для жыццёвых ветразей.

Прашу ў Бога: сыну  дай  імгненне
Для роздуму, для пачуцця.
Я не хачу, каб стаў ён на калені
Перада мной, як перад бацькам я.

* * *

Зачапіўся месяц за таполю,
Падглядае за дзяўчынай з хлопцам,
А яны цалуюцца да болю
І рагочуць пад таполяй моцна.

Не баяцца (а чаго баяцца?),
Часу многа ім да развітання.
Заляцацца — ну дык заляцацца,
Першы раз у іх жыцці каханне.

Хлопец ён прыгожы і высокі,
А яна - як ружачка дзяўчына,
Зоркамі гараць чатыры вокі,

Як над калаўроткамі лучына.

І не спяць,  турбуюцца бацькі:,
Сын прапаў, у іншых - дочка
Ён яе цалуе ля ракі,
Іх абодвух абдымае ночка...

* * *

Разлічыліся з намі затанна:
Шмат вярнулі дамоў хлапчукоў
“Грузам дзвесце” з Афганістана
Да счарнелых ад гора бацькоў.

Іх дзяды паляглі за свабоду,
А унукаў на смерць хто паслаў?
Мы з крывіцкага мірнага роду,
Які сеяў, касіў, жыта жаў.

За афганцаў стаялі алах і прарок,
Нашых Бог зберагчы ўсіх не здолеў.
Кожны лёг, як на пожню снапок
На ад спёкі патрэсканым полі.

На радзіме на помніках новых
Словы-слёзы блішчаць суцяшальныя,
Што выконвалі доўг свой вайсковы
Абавязак - інтэрнацыянальны.

Які  доўг у гарах ці ў пустыні
Спаганялі мы ў краі чужым?
Хто адкажа за тых, хто загінуў?
Над якімі сумуюць крыжы...

* * *

З вядром пустым не пераходзь дарогу,
Чужыя грошы доўга не трымай,
Ніколі не кляніся Богам,
Нялюбых у жыцці не абдымай.

За плот сваё не перакідвай смецце,
З чужога саду яблык не зрывай,
Ніколі не жадай другому смерці,
Радню сваю, бацькоў не забывай.

Дабру чужому не зайдросці,
Старому добрым словам адкажы.
Не запрашаюць – не ідзі у госці
І адступі хоць крышку ад мяжы.

Аддай, як просяць, свой кусок апошні,
Не кроч па буйным жыце напрасткі...
Бо прыйдзе час і на жыццёвай пожні
Адно пустыя знойдзеш каласкі.

* * *

Стогнуць  дрэвы пад востраю «шведкай»,
Збітым птахам ляцяць да зямлі.
Абдымаюць апошні раз сцежкі,
Пакідаюць ў зямлі карані.

За валюту, зусім без прынукі,
Нішчаць лес ад зары да зары.
Ці пачуюць зязюлю ўнукі
Ў стогадовым разважным бары?

Дрэвы роўна  пілой пакрыжуюць,

Абцярэбяць ды - на тартакі.
Ураз на дошчачкі распілуюць,
Спраўна зложаць у штабялі.

А далей будзе ўсё вельмі проста:
На машынах чужых — за мяжу,
Зробяць мэблю прыгожую з форсам
І на продаж назад прывязуць.

Хто ўбачыць, падумае: з густам
За мяжой могуць мэблю рабіць.
Не пазнае ніхто, гэта ж лес, беларускі,
Не дажыўшы свой век, гарнітурам стаіць.

## ЖОНЦЫ

У юбілейны твой дзень нараджэння
Будуць шчыра цябе віншаваць,
Адзін я папрашу прабачэння,
Буду рукі твае цалаваць.

Ты прабач мяне, родная, мілая,
Што цябе не заўжды шанаваў,
Хоць не часта, а быў і не чулы я,
Момант быў, што руку не падаў.

Мы старэем, ужо крочым павольна,
Крочым побач па нашай зямлі,
А гады прабягаюць няўмольна,
Адлятаюць хвілінкі і дні.

Пройдзе свята — усе знікнуць, як цені,
Бо і сонца плыве за гару,
Усё прабач, на твае калені
Мне дазволь палажыць галаву.

* * *

Я басанож пайду на дзедавыя курганы
І перад імі на зямельцы  ўкленчу.
Ім раскажу, што нарабілі мы.
А побач будзе толькі вецер енчыць.

Скажу, што  сталася з мяжой,
Якую продкі ў бойках ратавалі,
Жыццём разлічваліся за яе, крывёй
І ні на крок назад не адступалі.

Кавалі зброю ў кузнях мы сабе,
Вадой святой, малітвай гартавалі.
Шкада, што меч той не дастаўся мне,
Меч востры быў, крывіцкай сталі.

Скажу, што крыж святы наш згінуў,
Якога Богша ў Полацку зрабіў -
Ў руках яго трымала Ефрасіння,
Дзе знік ён? Хто яго згубіў?

А Біблія ў якім куточку свету?
Яе Скарына ў Вільні друкаваў.
Не памаліцца мне па ёй і маім дзецям,
Не ўбачыць літары, з якіх ён словы склаў.

На курганах я не скажу ні слова,
Як рунь, мы ўздымемся, нас не ўтрымаць.
Бо ёсць матулі, што на роднай мове
Спяваюць дзецям, калі кладуць спаць.

* * *

Стаіць магутны дуб ля вёскі Нача,
Схаваўшы ў дол глыбока карані.
І буры тут скуголяць, сумна плачуць,
Бо не пахіляць дуба да зямлі.

Жыве адзін магутны волат,
Частуе ўсіх сваімі жалудамі,
Ён церпіць спёку, церпіць холад
І песціць птушак добрымі рукамі.

Бывае, хмарка ціха прыляціць,
Прысядзе на яго шыракалісце,
Сам-насам у маркоце памаўчыць,
І паплыве далей, як знойдзе выйсце.

Парой зайздросны вецер сіпла плача
У галінах дуба, што адзін стаіць
Ля вёскі з назвай, што і рэчка Нача,
Як ён жыве, мы будзем доўга жыць.

* * *

Не сумуй, калі лета прайшло,
Яго зменіць цудоўная восень.
Не шкадуй, што здароўе ўцякло,
Яшчэ крыху зямелька паносіць.

Гані сум,  што кахання не стала,
Яго, можа,  зусім не было.
Не бяда, калі грошай замала –
Іх заменіць людское цяпло.

Што жыццё? - далікатнае шкло,

Не сумуй, у нейкі час яно трэсне.
Скроні срэбрам  няхай  занясло,
Не сумуй, бо было і прадвесне.

Сум пакінь, калі здрадзяць сябры:
Не сябры яны — вецер у полі.
Не сумуй, што пасохлі бары,
Бо і ў іх свая цяжкая доля.

А з бацькоў, калі  некага страціш,
Дзе б ні быў, гэта сэрцам адчуеш,
Прыляціш да радзімае хаты -
Загалосіш тады, засумуеш.

* * *

Як волат, дзед стаяў ля хаты.
Яго я гучна павітаў.
Ён запытаў: «Куды ж ты, браце?
А можа, я цябе чакаў.

Я чую, не згубіў ты мову,
Давай за гэта мне руку.
А як ты, хлопец, сячэш дровы?
- Сяку, як бацька, па суку.

Твой бацька добры быў мужчына,
Цябе ён хораша вучыў.
Таполю не сячы без кліна...
- Я ведаю. — Каб ты так жыў.

- Ну, добра. Ты хадзіў за плугам,
Араў на коніку зямлю?
Здаецца, ты б адзін не здужаў
Пазносіць бульбу ў варыўню...

А я насіў пудоў дванаццаць.
Рукой тры пуды падкідаў.
Калі было крыху  за дваццаць,
Ніхто мяне не барукаў.

Я да жанчын не заляцаўся —
Усё жыццё пражыў з адной,
У якую раптам закахаўся
Чароўнай, ранняю  вясной.

Няма ўжо мае Ганулькі,
А дзеці ўсе па гарадам.
-Пайшлі пад сала ды з цыбулькай
Кульнём з табою па сто грам".

...Сядзелі доўга ў дзеда ў хаце.
І плакаў ён, і рагатаў. І запрашаў:
- Заходзь, мой браце,
З табой я крыху акрыяў.

* * *

Сярод птушак вялікіх і дробных
Непрыкметна жыве верабей.
Мала з іх на каго ён падобны.
Так бывае і ў нас, у людзей.

Дзюбка хоць у яго  малая,
Невялікія, кволыя крылы.
Ежу сам ён сабе здабывае,
На свае спадзяецца сілы!

У шпакоўні ўсю зіму зімуе,
А вясной праганяюць шпакі.

Калі дожджык сячэ, дык сумуе,
Пазірае на ўсіх з-пад страхі.

Вельмі цяжка ў жыцці вераб'ю
З яго добрай душою і шчырай.
Я шкадую яго і люблю,
Бо ён побач — не рвецца ў вырай.

* * *

З цэркваў  людзі ідуць - дзякуй Богу.
Асвяцілі яйкі і пірагі,
Не згубілі тую дарогу,
Што загорвалі бальшавікі.

Маладыя ідуць вянчацца,
Немаўлятак нясуць хрысціць.
Каму трэба адсюль збірацца,
Свае ходзяць грахі замаліць.

А да Бога шлях цяжкі, вузкі.
Усе ж павінен прыйсці той час,
Калі большасць па-беларуску
«Ойча наш» скажа першы раз.

## Мая ўнучка

У добры час, у добрую хвіліну
Нам Бог усім падараваў
Дзяўчынку — нашу Кацярыну,
Якую вельмі я чакаў.

Бягу я часта да дачушкі.
Ну, крыху з ёй пагаманю.

А сам паціху да Кацюшкі –
На тварык хоць мяльком зірну.

Як падрасце, мы з ёю разам
Па сцежцы пойдзем на палеткі,
Пад вішняй пасядзім у садзе
І прынясём дахаты кветкі.

Увойдзем ціха, каб не чулі,
Паставім кветкі ў дзве вазы -
Ты — маме, я - тваёй бабулі,
Няхай стаяць букеты разам.

* * *

Цяжка мне, калі плачуць старыя:
Старых слёзы — не слёзы дзіцяці.
Недзе побач жывуць маладыя,
Гадавалі іх бацька і маці.

Цяжка мне, калі плача жанчына,
Не спыніць яе слёзы — хай плача.
Не хапае дачкі ёй і сына,
Дай ёй Бог сваіх унукаў убачыць.

І ў маёй, бацькам зробленай хаце,
Вельмі часта сумуе матуля.
Без мяне плача родная маці,
Хоць далёка жыву — але ж чую!

* * *

Каб мне ізноў па Горненскай дарозе
Праехаць хутка, каб курыўся пыл.

Няхай драбіны ляскацяць на возе,
Трымае лейцы дзядзька мой, Васіль!

Імчаць хутчэй! Ці, можа, нам спыніцца
На скрыжаванні, між спрадвечных дрэў?
Спыніся, конік, трэба мне напіцца
Вады з крынічкі — вельмі захацеў.

Вада ад сэрца. Чысценькая б'ецца
З-пад тоўстых, дужых каранёў.
Казалі людзі, хто яе нап'ецца,
З любых мясцін вяртаецца дамоў.

Лес малады расце на той дарозе,
Над ім жаўрук калыша неба сінь.
А з дзядзькам мы ўжо не зможам
На возе ехаць — бо памёр Васіль.

## Споведзь мамы

Пара збірацца ў свет далёкі, новы
Даволі сонейку мяне ўжо абдымаць.
Шкада, што пах зямелькі чабаровы
З сабою назаўжды мне не забраць.

Мы ўсё жыццё збіралі грошы,
Каб вам жылося крышачку лягчэй,
Сярод траіх ніхто з вас быў не горшы,
Для нас ніхто не быў і даражэй.

Жыццё цякло маланкава, імгненна,
Здаецца, учора калыхала вас,
Не так даўно трымала на каленях –
І вось прыйшоў мой развітальны час.

Пара збірацца... Я і не чакала,
А ўсё змясцілася на “ смерць” у чамадан.
У чым хаваць, строі сама сабрала,
Паклала  зверху свекрыві дыван.

Табе, мой сын, і просьба, і ўмова,
Калі мяне жанчыны скончаць прыбіраці,
Букецік невялікі чабаровы
У апошні шлях ты палажы для маці.

* * *

Зноў да нас прыляцелі буслы,
Шлях адолелі доўгі дадому.
Цягне ўсіх да радзімай зямлі,
У край святы і спрадвечна знаёмы.

Гнёзды трэба, як летась, прыбраць.
Каб было ў іх утульна, бы ў хаце.
Будуць тут яны зноў гадаваць
Буслянятаў — каб род свой не страціць.

Бацькі будуць няспынна, упарта
Вельмі часта лятаць на балоты:
Адзін ежу шукаць, другі будзе на варце —
Ратаваць птушанят ад спякоты.

Падрастуць маладыя буслы,
Паспрабуюць, ці дужыя крылы.
Асцярожна крануцца зямлі,
У расе свае дзюбы памыюць.

Пройдзе час на зацішным балоце,
Растлумачаць усім важакі,
Як ляцець, дзе прыціхнуць ў чароце,

Адпачыць ля гасціннай ракі.

Адляціць ланцужок нечакана
Чорна-белых у вырай буслоў.
Толькі ведайце — мы вас чакаем,
Як чакаюць сапраўдных сяброў.

* * *

Любяць дробязь шчупакі,
А шпакі парэчкі
Любяць чаплі - рыбакі
Пастаяць ля рэчкі.

Жаўрукі  майстры спяваць,
Вепрукі - прылегчы
Пчолы любяць мёд збіраць,
А вось хвалі - бегчы.

Крумкачам, бы пасядзець,
Качкам – папляскацца
Любіць доўга спаць мядзведзь
Вераб'і - спрачацца.

Любіць воду з рэчкі браць
Без вядра вясёлка,
У небе любіць паміргаць
Вокам жоўтым зорка.

Людзям трэба ўсіх любіць
Сэрцам чалавечым,
Нам наканавана жыць
На зямлі не вечна.

* * *

Жывіце, вёсачкі, не памірайце,
Бо разам з вамі знікне мова.
Нашчадкі родныя, хавайце,
Шануйце кожна наша слова!

Засохне бор, здзічэе сад
Іх чалавек пасадзіць знову.
Ці зможам мы вярнуць назад.
Як знікне, матчыную мову?

Яе з экрана не чуваць,
Па-руску там вядуць размову.
І “зоркі” любяць скавытаць
Пра "Heppy end" англійскай мовай.

На помніках, быццам чужым,
На развітанне пішуць словы
«вас любим, помним и скорбим»
Другою мовай - ганаровай.

Чаму ж мы памяць не шануем,
Бо прашчуры здаўна казалі
Аб тых, хто адыйшоў "сумуем"
І моўчкі ля крыжоў стаялі.

Засохне бор, здзічэе сад...
У кожнага свой шлях жыццёвы.
Не дай нам Бог, каб мы назад
Вярталі згубленую мову!

* * *

За акном дзяўбуць сініцы
Ежу, што я ім паклаў
Ах, мае вы чараўніцы,
Як даўно я вас чакаў.

І адкуль вы прыляцелі,
Як усіх вас накарміць?
Калі лютуюць мяцелі
Вам узімку цяжка жыць.

Не шкада кавалкаў сала,
Крошак, семак не шкада.
Толькі б часта прылятала
У госці птушак чарада.

Сярод іх няма багатых,
Роўняй усе яны жывуць,
Не будуюць веліч-хаты
І пазыкі не бяруць.

Нават на маім акне
Толькі крышку пасядзелі,
А далей, што Бог пашле, -
Недзе дружна адляцелі...

Не ўзялі мяне з сабою,
Далібог, я б з імі жыў,
Можа мне лёгкай рукою,
Хто б натхнення накрышыў.

* * *

Дагараеш, задумлівы клёне,
Трапяткім  агнём, дзіўным ля поля.
Зноў вясною ты станеш зялёным
Я ўжо русым не стану ніколі.

Вецер гонкі гуляе на волі,
Адзінота - яго гэта доля,
Дзе лятаць ён не просіць дазволу,
А вось я не змагу так ніколі.

Не сагнуць дуб вячысты да долу:
Мае гонар стары дуб, хоць кволы.
Я ўжо гнуся, скрыпяць мае колы,
Хоць і крочу, здаецца, паволі.

Маё сэрца аж рвецца ад болю:
Бачу, вёскі канаюць ў нядолі,
Як так сталася? Хто  з нас  дазволіў?
Вёскам стаць для нашчадкаў юдоллю?

Як і клён, я чакаю вясну:
Ветрык будзе з усімі сваволіць.
Мо ад думак сваіх адпачну,
Развітаюся з сумам і болем.

## Засцярога

Сёння ад сэрца моляцца
Вернікі на абразы:
- Маці Хрыста , Багародзіца,
Божа, дапамажы!

Веры святой узняцца

Над Беларуссю ізноў,
Храмам былым падняцца
З асірацелых муроў.

Цэрквы з узгоркаў, касцёлы
Клічуць званамі людзей,
Клічуць да Бога Анёлы
Сталых, старых і дзяцей

Людзі пара спыніцца
Досыць зямных грахоў,
Час надышоў маліцца
Нам за сябе і бацькоў!

Хопіць гнявіць нам Бога
Грэшным жыццём сваім,
Шле ён даўно засцярогу
Нам - на зямлі жывым.

СНІД, землятрусы, цунамі
Смерць прывялі з сабой,
Бог яшчэ сёння з намі -
Побач з табой і мной.

Толькі, каб не спазніцца,
Да той не дайсці мяжы,
Дзе позна, будзе маліцца:
- Божа, дапамажы!

* * *

Згубленая з капыта падкова
На шчасце прыб'ецца.
Хто згубіў матчыну мову,
Той жыве без сэрца.

* * *

Як усіх у жыцці, мяне не стане...
Пакладзіце сшытак мой у шуфляду ўніз
Можа з часам, мяне  хтось  памяне
Нават тым, што перагорне ліст.

* * *

Калі машына больш, чым 50, не едзе -
Вылазь з яе і шпар па бальшаку.
Бо сама менш пад сотню недзе
Патрэбна жыць і ехаць мужыку.

У 50 крумкач -  яшчэ падлетак,
Баіцца нават каркнуць на суку,
А вось пісьменнікі, паэты
У 50, як кажуць, у саку.

У 50 кастром гарыць каханне,
Не тлець у ім сівому вугальку.
Жыццё ў зеніце, а не на змярканні
І моц душы не горш, чым каньяку.

У 50 нам рана сумаваць,
Бо большасць з нас яшчэ і не дзядулі.
... Але ж у лесе боязна пытаць,
Жыць засталося колькі  у зязюлі.

## У бібліятэцы

Не хрышчуся, а шапку здымаю
Перад тым, адчыніць калі дзверы.
Як зайду усіх  ціха вітаю,

Тых, хто любіць радкі на паперы.

На паліцах тут душы людскія -
Побач у роўных шарэнгах стаяць.
На старонках яны ўсе жывыя,
Іх уважліва трэба чытаць.

Клічуць кнігі пакрочыць па свету,
Жыць каханнем, надзеяй людзей.
Адкрываюць нам сэрцы паэты-
Сам Рудкоўскі, Марук і Гардзей.

Нас вітае песняр - Якуб Колас,
У вёсцы Люсіна ён шчыраваў.
Мне чуваць і Праскурава голас,
Які побач зусім працаваў.

Цішыня... Раяць нешта жанчыны,
Вочы свецяцца іх цяплынёй.
І нясуць чытачы несупынна
Адсюль веды дахаты з сабой.

Водар дзіўны агортвае залы,
Абдымае за плечы спакой.
Асцярожна выхожу, памалу...
Адпачыў, прычасціўся душой.

## “АДКАСІЛІ”

Дзе яны, што цябе навучылі?
Хто твой розум юнак замуціў?
Гэта ж трэба цябе "адкасілі",
Каб у войску, крый Бог, не служыў.

Як глядзіш ты дзяўчатам у вочы,
Дзе хаваеш свой "воўчы" білет?
Ты да службы такі не ахвочы
Пацікаўся, дзе згінуў твой дзед.

Прашчур твой быў адважным салдатам,
Супраць ворага мужна стаяў.
Ён з баёў не вярнуўся дахаты.
Дзе  да гэтага жыў і кахаў.

З-за вайны сваю жонку і сына
Назаўжды ён пакінуў дваіх
Іх сабой засланіў, сам загінуў-
Смерць касіла ў той час маладых.

Як магла, гадавала бабуля
Твайго бацьку, каб род аднавіў,
Каб унук быў падобны дзядулі
А ты здрадзіў яму - "закасіў".

Не адступім, дакуль хопіць сілы
Так як продкі ў войнах былых!
А дзе будзеце вы? З тых, хто "адкасілі"
Ці не станеце ў строй да чужых?!

* * *

Мне здаецца,  у  добрую глебу
Клаў з сявенькі я вершы-зярняты.
Марыў, коласам узнімуцца ў неба
На сцяблах яны гнуткіх, цыбатых.

Думаў я, усяго ім хапала:
Навальнічных дажджоў, туманоў,
Песень радасных, што ім спявалі
Жаўрукі - вартавыя палёў.

Дрэмлюць вершы мае ў цішыні.
Што ім тут, у зямлі, бракавала

Мне здаецца - людской цеплыні
І мяне ж, яна часта мінала.

Пацярплю. Я ўмею чакаць...
Маім ўсходам каб дружна ўзняцца,
Трэба доўга ў зямельцы ляжаць —
Яе мудрасці, сілы набрацца.

* * *

Адкуль наш род? Якой прыйшоў дарогай?
Мой дзед казаў, мы з добрых каранёў,
Грахоў баяліся і верылі у Бога,
Да самай смерці бераглі бацькоў.

Чапляўся хто - мы з тым маглі пабіцца,
Але па-чэснаму,  да першае крыві.
Студзілі твар гарачы  ля крыніцы,
Ваду гаючую ў прыгаршчах няслі.

Ніхто не помніць прашчураў аблічча,
Няма ўжо іх і  зніклі іх крыжы.
Калі мяне ў неба журавы паклічуць,
Пра нас, мой сын, ты памяць зберажы.

Збірай пра радавод  усё, што  знойдзеш,
Бо й ты прыкрочыў  да свае мяжы.
Каб унук  твой ведаў, праўнук помніў,
Сумуюць дзе над продкамі крыжы.

* * *

Зараз не ўважліва вітаюць —
Так, кіўнуць адчэпна галавой.

Мо і добра, што не заўважаюць:
Лепш чужы, чым не сапраўдны свой.

Тыя людзі ў жыцці, як хвалі,
Вецер выбірае ім прыбой.
Мне радней , што ўсё не шкадавалі,
Усім дзяліліся – і шчасцем, і журбой.

* * *

Як памру, то хачу белым буслам
Над зямлёю яшчэ палятаць,
Піць вадзіцу з крыніц дзюбай-вуснамі,
Туманы над сабой узнімаць.

А пазней да мяне ціха-ціха
На маё на таполі гняздо,
Каб мая прыляцела бусліха,
Прытуліла сваё крыло.

І хачу я, здаецца, нямнога —
Да мяне каб вярнулася тая,
Што была даравана мяне Богам,
Мая жонка, якую кахаю.

## Ойча наш

Прасіла мама: «Пацеры вучы».
Ты бачыш, што жывём мы ў бядноце.
Тады ці светлым днём ці ўначы,
Цябе Бог не пакіне ў адзіноце.

Каб слова ў слова ведаў «Ойча наш»!

Не забывай яго. Прасі ў Бога,
Каб ён табе падмог у цяжкі час.
Адно прасі, сынок, не надта многа.

І я прасіў у жыцці сваім не раз,
Упершыню  -  калі ішоў вучыцца,
Шаптаў я ціха: “Ойча” наш.
Дапамажы  ў дарозе  не спыніцца!»

Пазней, калі пачаў служыць,
Тады, як запраўляў ракеты,
Прасіў я : «Ойча наш, дапамажы
У атруце не згарэць — чакаюць дзеці».

Калі пускаў ракеты я  скрозь хмары
У Далёкі, невядомы акіян,
Прасіў у Бога: збыцца марам,
Якія мне навеяў Казахстан.

З Сібіры я з сям'ёй хацеў вярнуцца
І зноў прасіў у Бога: «Ойча наш,
Дапамажы нам дома апынуцца,
Як родных, хай радзіма прыме нас».

Матулін помню ўсё жыццё наказ:
Як прыйдзе час з жыццёвай сцежкі збочыць,
Хачу паспець прамовіць «Ойча наш»,
А потым і заплюшчыць вочы.

## Ганцавічы

Два буслы збоч дарогі ў танцы –
Абняліся, пусціліся ў скокі:
Гэта вас так вітаюць Ганцавічы –
Гарадок наш, мой край сінявокі.

Горад наш, малады, працавіты,
Над балотам рукамі ўзняты.
Ён сябруе з каштанамі, ліпамі,
Ганарыцца сваімі дзяўчатамі.

За лясамі імшары багатыя:
Там  шчыруюць мужчыны, жанчыны -
І нясуць на сабе кіславатыя,
Усім карысныя журавіны.

Горад наш прыгажэе, будуецца,
Маладыя растуць ганцаўчане.
У жыцці іх няхай усё збудзецца –
Думкі-мары і ўсе іх жаданні.

* * *

У жыцці для мяне ўсё не проста,
Не спрыяюць мне нават і сны.
Без супынку жыццёвыя кросны
Усё ткуць з маіх дзён дываны.

Не хапала  мне роднага слова,
Бо яго я ў вандроўках губіў.
Умацуй дух мой, матчына мова,
Дай набрацца з крыніц тваіх сіл.

* * *

Многа развялося крумкачоў:
Каркаюць высока над ялінамі.
Можа, ім жыць  трыста гадоў.
Але ж не спяваць па-салаўінаму.

## Песенная

Ты  чаму, ты  чаму, мілы  мой,
З нашай сцежачкі збочыў
І чаму пры сустрэчы са мной
Апусціў долу вочы?

Я цябе, я цябе, любы мой,
Да яе не раўную.
Ты ідзі па сцяжынцы другой,
Як знайшоў ты другую.

Без цябе, без цябе, родны мой,
Я адна не загіну.
Ты скажы лепш, чаму ж ты свой боль
У маім сэрцы пакінуў?

Ад мяне, ад мяне, дружа мой,
Не хавай свае вочы.
І не бойся сустрэцца са мной,
Калі сэрца не хоча.

* * *

Каля хаткі бабуля прысела,
А пазней дзед прынёс гармонік.
Селі побач грыбочкамі белымі,
На калені зламжылі далоні.

Потым ціха дзядок заіграў,
Сум паліўся з надворка на волю.
У гэты час кожны з іх успамінаў
Пра сваю, пра нялёгкую долю.

Успаміналі, як цяжка было

Гадаваць, падымаць сваіх дзетак,
Як жыццё непрыкметна прайшло,
Адляцела да восені з лета.

Маладзік над зямлёй засынаў,
А яны ўсё сядзелі двое.
Ён адною рукою яе абдымаў,
А гармонік - другою.

## Палешукі

Край палескі дзіўны, гожы,
Не злічыць твае вякі.
Тут жыве народ прыгожы,
Мы з табой — палешукі.

Нам у працы няма роўні,
Не жывём, бы лайдакі.
На вяселлі п'ём па поўнай,
Мы з табой — палешукі.

Мы на свята добра граем,
Бяром бубен і смыкі.
Песняй край свой услаўляем,
Мы з табой — палешукі.

У Расіі з Украінай
Нас чакаюць землякі,
Сваякоў з іх палавіна,
Мы з табой — палешукі.

Шчыра ў госці запрашаем,
Падаём ручнік з рукі,
З чыстым сэрцам сустракаем,
Мы з табой — палешукі.

**Абеліск**

Тут, на Палессі, дзе жыта кусціцца,
Побач з таполяй стаіць абеліск.
Сэрцу матулі старэнькай не спіцца,
Птушкай трапеча, да сына ляціць.

Ветрам ляцела, шукала хвілінку,
Каб наглядзецца, як след, на цябе.
Дзе твая, родны, прапала сцяжынка?
Хто запыніў, не пусціў да мяне?

Сумнымі сталі, сынок, твае вочы,
Ў горы няўцешным застылі яны.
Я ўсё чакаю цябе днём і ноччу
З першага ранку праклятай вайны.

Звон над зямлёю плыве вечаровы,
З неба па хмарах спускаецца ўніз.
Плача матуля пад шум тапалёвы,
У горы маўкліва стаіць абеліск.

* * *

Рэчка блакітная стужкаю ззяе,
Льецца вясновая  песня шпака.
Сэрцам гарачым дзяўчына кахае
Хлопца бялявага — палешука.

Вольна плывуць белагрывыя хвалі,
Іх беражліва калыша рака.
Добрую долю дзяўчына прыдбала,
Мужа руплівага — палешука.

Будзе няўтульна жанчыне на свеце,

Ён падтрымае, надзейнай  рукой.
Вырастуць добрымі, шчырымі дзеці
З роду славутага — палешукоў.

Старасць сустрэне, не змерзне ніколі,
Доўга не зносіць таго кажушка,
Сшытага любым на добрую долю
Вернай рукою — палешука.

* * *

Занясло сляды гадамі,
Памяць сумам занясло,
Шлях далёкі паміж намі,
І згубілася вясло.

Нясе човен хуткай плынню,
Крыху працякае ён.
І плыву я несупынна
Ўніз за сіні гарызонт.

Можа, дзе каго сустрэну,
Падплыве хто на рацэ.
Зноў настане перамена,
Зноў вясло будзе ў руцэ.

Я да берага прычалю,
Адпачну, далей пакрочу.
Хай аб човен б'юцца хвалі
І плыве на ім хто хоча?

* * *

Я нікога не кахала,
Сэрца звыклася са сцюжай.
А калі яго спаткала,
Расцвіла чырвонай ружай.

Ведаю, ён развядзённы
І ў яго была сям'я.
Ён мне лёсам нарачоны,
А яму, напэўна, я.

Шэпчуць - шчасця з ім не будзе,
Быццам, ён мне не раўня.
Асуджаюць мяне людзі,
Папракае ўся радня.

Ад кахання нашы сэрцы
Зазвінелі гулкім звонам.
Будзь адзіным мне да смерці
І жаданым, развядзённы.

* * *

Што ты, голуб шызакрылы,
Лямантуеш ля акна,
Мо згубіў сяброўку мілу
І шукаеш, дзе яна?

А якога ты ўзросту -
Малады, зусім стары?
Бо старому жыць не проста,
Цягне ўніз, не дагары.

У старых слабыя крылы,

Ім у пары жыць лягчэй.
Не ўзляцець да небасхілу,
А ўдвух у гняздзе цяплей.

Паляцеў... Не развітаўся,
Не махнуў нават крылом.
Ты чаго мяне спужаўся?
Я ў пакоі за акном.

* * *

Дробны дождж. Сум. Гаркота.
Нейкі жаль агарнуў маё сэрца,
Падзялілі з табой адзіноту.
Ты свой боль з маім церпіш.

Вецер сціх. На галінах сініцы.
Па пакоі блукае спакой.
На бярозках няма завушніцаў,
Рэшта іх абляцела зімой.

Дождж сячэ. Пашыраюцца лужыны,
Воўнай белай туман над зямлёй.
Свет шырокі, а сёння ён  звужаны
Бо няма  цябе побач са мной.

Шэры дзень. Сівы голуб за шыбай.
Хмары ў небе плывуць за акном,
Я жывы. І лічу, што шчаслівы,
Пакуль разам  з табою  жывём.

* * *

Я ніколі чужым не зайздросціў,
Не пытаў, колькі грошай у іх,
І за крыўду нікому не помсціў,
Адпусціць прасіў Бога грахі.

Не па той часта крочыў дарозе -
У жыцці вельмі многа шляхоў.
Быццам конь я: стомлёны, у возе,
Расцугляны, але без падкоў.

Мо пакрыўдзіў каго, дык прабачце,
Вельмі цяжкі, турботны наш век.
Быў не часта ў цябе, мая маці,
Памыляўся, бо й я чалавек.

Баліць сэрца, стаміліся рукі,
Больш хілюся да роднай зямлі.
Усе прабачце - і дзеці, і ўнукі,
Мая жонка, ты сум мой прымі:

Прыйдзе час, адплыву ад прычала:
Нас не любяць чакаць караблі.
Дзякуй, родная, што ты чакала,
Мне была маяком на зямлі.

* * *

Жыта ясным днём засумавала,
Апусціла каласоў чубы.
Бы малітву ціха зашаптала
Шэптам невыразным і слабым.

Жыцейка дазволь мне ля цябе

У цянёк пад дзічкай легчы збоку.
Раскажы хоць крышку пра сябе,
Як прыйшло ты з даўніны далёкай.

Мне гады твае не палічыць,
Зернем паляглі яны ў глебу.
Здолела ты многіх накарміць
Мой няўдосталь духавітым хлебам.

Калі ў хаце голад быў і пуста,
Слёзы выціраючы з вачэй,
З бохана танюсенькую лусту
Маці адразала для дзяцей.

Не маглі апошнія зярняты
На муку змалоць — іх бераглі.
Каб вясною на сцяблах цыбатых
Каласкі ўзняліся ад зямлі.

Не журыся, залатое жыта.
Ты на покуце заўжды ля абразоў.
На снапочак, стужкаю абвіты,
Молімся даўно, спакон вякоў.

* * *

Шмат разоў ты мяне ратавала,
З кіпцюроў вырывала ў смерці.
Мне здаецца, што ты й не чакала,
Што слабым з часам стану на сэрца.

Даганяюць, на жаль, даганяюць
Тыя дні, калі ў войску служыў,
Вострым болем за сэрца хапаюць,
Бо занадта адказны я быў.

Часта сняцца мне тыя мясціны,
Па якіх у БТРы я еду,
А за ім баявыя машыны
Воўчай зграяй нясуцца па следу.

На праверкі мяне падстаўлялі:
Маўляў,  справіцца, вопытны  ён,
І на пускі ракет адпраўлялі –
Мой ракетны дывізіён.

Два разы рвалі неба ракеты
У акіян я іх сам запускаў.
Кожны пуск у той час непрыкметна
Мне на сэрцы рубец пакідаў.

Падначаленых усіх я бярог
Мне салдаты былі быццам дзеці.
А сябе зберагчы вось не змог
Два рубцы абнялі маё сэрца...

## Берасцейская зямля

Сярод дзіўных азёр і рачулак,
Дзе бары ўзняліся з камля,
Нас сагрэла, дала нам прытулак
Берасцейская наша зямля.

У якіх мы краях не бываем,
Быццам птушкі, дамоў, а пасля
Да цябе мы назад прылятаем,
Берасцейская наша зямля.

Усё наша тут:  нівы, і межы,
Звон царкоўны, што кліча здаля,

Старажытныя белыя вежы.
Тут радзіма, тут наша зямля.

Нам ніколі на ёй не згубіцца,
Продкаў нашых відна каляя,
Як яны, будзем мы ганарыцца
Нашай маці - табою, зямля!

Ты нам люба да самае смерці
Кожнай кветкай, расінкай  з галля
За цябе я аддам сваё сэрца:
Берасцейская наша зямля.

* * *

Сыпле жменямі снег завіруха
На палі, на бары, на людзей,
У шаляноўцы зімовай сасна-векавуха
Прыгажэй стала і вясялей.

Сярод дрэў пагубіліся сцежкі,
Вецер свішча высока ўгары -
Усё не знойдзе ніяк сабе месца,
Потым сціхне на хвойках ў бары.

Хутка ноч дабярэцца да вёскі,
Месяц зоркі збярэ малады,
Не ляскочуць даўно ўжо кросны,
Бо не ткуць у пасаг дываны.

Не гарыць, не міргае лучына,
Калаўротка даўно не пяе,
Не бягуць на вячоркі жанчыны,
З воўны нітку ніхто не прадзе.

Позна сонца зімовае ўстане,
Пад праменнямі снег заблішчыць.
Навакол так цудоўна, як глянеш,
Так прыгожа, што хочацца жыць!

* * *

Шкада, відаць канец дарогі,
Дзе першы крок  жыцця  зрабіў.
Хоць тут свае стаптаў я ногі,
А мне здаецца, што й не жыў.

Шкада, што скроні пабялелі
І позірк стаў зусім другім.
Калі, гады, вы адляцелі,
Бы з коміна гаркавы дым?

Шкада, што могілкі растуць,
Бары ў пакутах хутка сохнуць,
Што хлеб у печах не пякуць
І што за крыўду сталі помсціць.

А дзе каса, што ты насіла
Снапком жытнёвым на плячах?
Сукенка дзе, што ты любіла,
Дзявоцкая, у касачах?

Куды падзеўся той разліў
Зальвянкі,  увесну гаманлівай?
Здаецца, я яшчэ не жыў,
А стаў, на жаль, такім чуллівым.

* * *

Вецер, увосень нецвярозы,
Вырваўся з хмяльных садоў,
Лісце абарваў з бярозы,
Жалудоў натрос з дубоў.

Прыставаў і да асіны,
Чуб у клёна растрапаў,
Гронкі абабіў з рабіны,
Пыл густы слупком падняў.

Ціхае збудзіў балота,
Лужы рыжыя змуціў,
З пажаўцелага чароту
Кудлы дзіўныя скруціў.

Буйны, доўга выў у полі,
Скуб салому са стагоў.
Многа выцягнуць не здолеў
І адправіўся дамоў.

Дом яго - сам бор кашлаты.
Тут ён сціх, цвярозы стаў,
На яловых мяккіх лапах
Доўга ўсхліпваў, засынаў.

* * *

Калі сэрца баліць, калі сумна,
Я ніколі не йду да людзей.
Я за вёску іду.  Там за гумнамі

Лес чакае мяне чарадзей.

Ён, гаючы, не здрадзіць ніколі,
Расказаць яму можна ўсё,
Пра сваю неспакойную долю,
Пра імклівае наша жыццё.

Хоць ён корміць усіх, саграваe,
Усё, што мае, гатовы аддаць,
А не кожны яго паважае
І імкнецца адно толькі ўзяць.

Прашчур наш сухастой браў на дровы,
Мох з лісічкамі разам не драў.
Пруцік гібкі на кошык лазовы
Браў у рукі, а потым зразаў.

Мая бабка малітвы шаптала
Перад тым, як заходзіла ў лес.
Прымушала і нас ды казала:
"Каб лясун да вас, дзеткі, не лез".

Не было ў лесе роўных дарог,
На скрыпучых вазах абміналі
Той мурашнік і нават мурог -
Бераглі, для дзяцей шкадавалі.

З лесу радасна ўсім нам было
Несці кошык грыбоў сарамлівых,
Як шкада, што дзяцінства прайшло,
Што няма маіх рыжыкаў сініх.

З лесу крочу ў вёску, да гумнаў:
Ачуняў, стала сэрцу лягчэй.
Адзінока без лесу мне, сумна,
А вяртаюся зноў да людзей.

* * *

Мне прысніліся зноў твае вочы,
Як шкада - ты не побач са мной.
Ты чаму, мой каханы, не хочаш
Падзяліцца журбою сваёй?

Я чакаю цябе,  так  чакаю
З той мінулай афганскай вайны...
Толькі ў марах цябе абдымаю.
Нарачоны мой, дзе зараз ты?

Калі ў войска цябе адпраўляла,
“Дачакайся” - ты любы казаў.
Абяцанне сваё я стрымала,
А сваё ты чаму не стрымаў?

Абяцаў мне вярнуцца вясною
І што пойдзем да шлюбу з табой.
Зажывём разам дружнай сям'ёю
У новай хаце з прыгожай страхой.

Я чакаю цябе, усё чакаю,
Я нявеста, не жонка твая.
Толькі ў марах цябе абдымаю,
Дзе ты сум мой, надзея мая?

* * *

Мне не прылегчы на бацькоўскі ложак,
З матуляй ночку ўсю не гаманіць.
Трапеча сэрца, зразумець не можа:
Чаму ўнукам тут цяпер не жыць?

Жывуць чужыя ў нашай роднай хаце,

З якой мы адляцелі назаўжды.
А мне не спіцца - думаю пра маці,
Ці добра ёй на шостым «этажы»...

Хоць ведаю, што не адна, з дачкою
Ды моліцца на тыя ж абразы,
Што некалі былі ў нашых пакоях,
І просіць: "Ойча наш, дапамажы,

Вярнуцца мне на Зэльвенскі пагорак:
На ім даўно чакае гаспадар.
У адной аградцы будзе наш падворак,
Адзіным будзе дождж з вясенніх хмар

...Хаваю здымак з бацькаваю хатай,
А ў сваім сэрцы - роспач і тугу.
Няхай жывуць у ёй і доўга, і багата.
А вось зайсці ў хату не магу...

* * *

Сёння восень на маім двары,
А на скронях нечаканы іней.
Адлятаюць даўнія сябры
Безгалосым  незваротным клінам.

Ноч  са мною стала  сябраваць –
Не магу заплюшчыць доўга вочы.
Успаміны не даюць мне спаць,
Маё сэрца сцішыцца  не хоча.

Марамі  лячу  ў маладосць,
Думкамі - назад, у сваю хату.
Я цяпер ў ёй не жаданы госць -
Гаспадар былы, дзівакаваты.

Хата перароблена даўно
На свой лад чарговымі жыльцамі.
Памянялі нават і  акно
На верандзе, устаўленае намі.

Засталіся толькі  нашы брама
Ды яшчэ цалейшыя кашы.
Каля плота  сіраціна-камень -
Вартавым адвечным  на мяжы.

Восень засыпае на двары
Жоўтым лісцем тое, што збылося.
Ледзь відаць пад ім мае сляды...
А зіма здалёк крычыць, галосіць.

* * *

Не шкадуюць мяне мае вершы,
Не даюць мне спакойна заснуць.
Вострым болем праходзяць праз сэрца,
У палон маю душу бяруць.

Каб паставіць у радок побач словы,
Колькі трэба мне іх перабраць?!
Бо павінна матуліна мова
Па-сапраўднаму добра гучаць.

Не магу сваё сэрца прымусіць
Успрымаць, што навокал, прасцей.
Бо належыць яно Беларусі,
Яна маці  для ўсіх нас - дзяцей.

Сярод іх - не апошнім, не першым –
Пасівелы ад думак стаю...

Усё турбуюць мяне мае вершы,
Я сумую ў іх і пяю.

## Ветэранам

Не крочыў я па франтавых дарогах,
Сяброў адважных, верных не губіў,
Не сустракаў раптоўныя трывогі -
Бо ў час ліхі той я яшчэ не жыў,

А сёння, калі бачу ветэранаў,
Якіх не часта можна ўжо сустрэць,
Як сцягу, ім выказваю пашану
І, як вайскоўцам, аддаю ім чэсць.

Снарады, кулі іх не шкадавалі.
Назад не ўсе вярнуліся дамоў.
А колькі іх, забітых, пахавалі
У краях чужых без зорак і крыжоў!

І колькі іх не сустракае ранкі,
Не адзначае Перамогу з намі!
Па іх ляжаць сухія “похоронки”,
Балючай памяццю за абразамі.

Нашчадкі мы знайсці павінны
Апошні след іх мужны на зямлі,
Узвесці помнік па ўсіх адзіны
Ім, што Радзіму нашу зберaглі.

## Я шчаслівы...

Я шчаслівы, бо я нарадзіўся
У руплівых  набожных бацькоў.

На каханай і вернай жаніўся,
Дзетак добрых "прыдбаў" у буслоў.

Я шчаслівы, бо я на магілы
Прыязджаю наведаць дзядоў.
Мне так радасна жыць сярод мілых,
Беларускіх палёў і лясоў.

Я шчаслівы, што я не бязродны,
Бо куток запаветны знайшоў.
Нават сёння сваяк мяне кожны
Запрашае, каб у хату зайшоў.

Я шчаслівы, бо парасткі-ўнукі
Паднімаюцца шумна з зямлі.
І што жонкі гаючыя рукі
Двойчы смерць ад мяне адвялі.

Я шчаслівы, бо я застануся
Дробнай рыскай у праўнуках жыць.
Праз стагоддзі назад я вярнуся
Свежым ветрыкам навальніц.

## Мае дзяды

Мае дзяды былі такімі рознымі :
З усмешкай жыў каваль Андрэй,
Васіль-цясляр здаваўся грозным
І вельмі строгім да людзей.

Майстры яны былі на славу.
Сярпы, плугі каваў Андрэй.
Васіль - хлявы і хаты ставіў,
Ды ладна так, бы чарадзей.

Сыны чатыры, як дубочкі,
Узняліся з каранёў Андрэя.
А ў Васіля чатыры дочкі
Цвілі ў хаце, бы лілеі.

Няма даўно маіх дзядоў.
Век дажываюць іх сады і хаты.
А кожны яблык з тых садоў
Маленькім стаў і гаркаватым.

Род адмірае Васіля
Ляскевічаў амаль няма на свеце.
А з Галаскокаў застаюся толькі я,
Стрыечны брат, ды нашы дзеці.

Не засталося прашчураў слядоў,
Іх замяла жыццёвая завея.
Я не заўважыў, калі час прайшоў:
Што сам ужо дзед і быццам сад старэю.

## Чужая маці

Зжаўцелыя фіранкі на акне
У згорбленай, счарнелай хаце.
Так хочацца зайсці ў адведкі мне
Неспадзявана да чужое маці.

Не церпіцца ў старэнькай папытаць,
Жывецца як, дзяцей ці часта бачыць.
Але баюся моцна напужаць,
Бо я не сын і мне яна не маці.

Я бачу, трэба снег паадкідаць
Ад вуліцы да веснічак і хаты.
Лапату, пэўна, ёй не ўтрымаць -

Кіёк сухі і той стаў цяжкаватым.

А хлеб? Ці ёсць ён на стале?
Ці бохан  з крамы ўсё ж прынесці?
Зжаўцелыя фіранкі на акне -
Ад іх мне позірк не адвесці...

* * *

Просіць Бога  дзед пад вішняй
Каля плота на двары:
- Божа Праведны, Усявышні,
Я нажыўся – забяры...

Не  хачу ісці дадому,
У адзіноце начаваць.
Каб хто ведаў, як старому
Цяжка век свой дажываць.

Непатрэбны  стаў нікому.
Дзеці  ў  горадзе жывуць.
А такіх, як я, вядома,
З вёскі  рэдка забяруць.

Моладзь кожны дзень на працы,
Дый пакоі іх – каморы.
А я зараз  горш дзіцяці,
Бо зусім нямоглы, хворы.

Каб вярнуць гады і жонку,
Усё інача́й  я б рабіў.
Ваду раніцай у вядзерку
Толькі б сам дамоў насіў.

Як  раней, карчом бы ў хаце

Не сядзеў, дапамагаў.
Зразумеў, як жонку страціў,
Што яе  не шкадаваў.

А яна  ж усё рабіла
Для мяне  і для дзяцей.
Абмывала нас, карміла...
Я ж – работу, што лягчэй.

Жонка пчолкаю лятала
У лес па ягады, грыбы.
Шмат чаго напрыбірала:
Поўны склеп – ідзі, бяры.

Мо, старэнькая, пачуеш?-
Ты да Бога ўсё ж бліжэй.
Папрасі, хай пашкадуе –
Забярэ к табе хутчэй.

* * *

Знішчылі  не землятрусы
Культуру ацтэкаў і майя.
Няўжо так і нас, беларусаў,
Гаротная доля чакае?

У пакутах канае мова,
І нішчаць яе не чужыя.
Квітнеючы  сад на дровы
Сякуць  беларусы былыя.

Не раз  мову з хаты гналі,
За ёй зачынялі дзверы.
Яна, зноў з кален уставала,
Неўміручая,  так як  і вера.

Усё жыццё сваё ганаруся
Нашай спадчынай – роднай мовай,
Прыгажуняй маёй, Беларуссю
І яскравым бацькоўскім словам.

**70 –годдзю М.Рудкоўскага прысвячаю...**

“Дзень добры, шаноўны Міхась!”
Ніколі табе не казаў,
Бо я ў недалёкі той час
Не тут свае сцежкі таптаў.

Чаму не дазволіў мне лёс
З табою хоць раз павітацца.
І ў вёсцы, дзе жыў ты і рос,
Па-брацку, сардэчна абняцца?

Мясціны ты  мне б паказаў:
Адзінец, дзе зубр уладарыў,
Той ельнік, дзе ён паміраў,
Свае пакідаючы мары.

А потым з пахучых кублоў
Мы б сала з табой каштавалі.
Зарана з жыцця ты пайшоў
Ад нас у адвечныя далі.

“Дзень добры, шаноўны Міхась!”
Вітаю цябе я з паклонам,
А ты мяне кожны раз –
Радкамі “Залатазвона”.

## Плача каня

Плача каня над былой рачулкай,
Купінку не знойдзе  для гнязда.
Плач вісіць шчымлівы, гулкі
Над зямлёю, дзе была вада.

Хмызнякі панууюць на тым месцы,
Не відаць  нат лужыны нідзе.
А калісьці тут спакуснік-месяц
З зоркамі гарэзіў  у вадзе.

Шмат птушыных тут было чародак,
Моладзь адлятала з іх у свет.
І прастор быў для чаўноў і лодак...
Знішчыў усё бяздушны чалавек!

Асушыў, павыганяў  бы з раю
Братоў  меншых з кроўнае зямлі.
Ні лугоў, ні ворыва не маем
Там, дзе хвалі чыстыя плылі.

Продкі нашы шчыра, без падману
Дазвалялі побач  жыць усім.
Не ў нябёсах горка плача  каня -
У сэрцы растрывожаным маім.

* * *

Яшчэ  цвіце  той бэз ружовы
На могілках вясною:
Туды  для  шчырае размовы
Хаваліся з табою.

Шаптала  ты з адчаем  мне,

Жыцця   няма што ад бацькоў.
І  брат  ніколі не міне,
Таксама ён марнуе кроў.

Сваім  і  я  дзяліўся болем –
Між намі тайны не было.
Па  пяць гадоў было, не болей,
Табе  і  мне - і  ўсё  прайшло.

Яшчэ  цвіце  той  бэз  ружовы:
Ён  стаў прытулкам салаўя.
Каб  зноў  у той  куст,  якія б словы
Сказала, ты?  Якія - я ?..

* * *

На людзях - вясёлая, шумная,
Здаецца, шчаслівей  няма.
А дома - сапраўдная,  сумная,
Калючая, быццам зіма.

У святы танцуе, спявае,
Нікому прысесці не дасць.
Вяргіняю расцвітае,
Але не  даецца  сарваць.

Сваё не ўтрымала каханне:
Яно ўцякло да другой.
Казала  сабе: "За чаканне
Найлепшы з усіх будзе мой."

Найлепшыя - снегам сышлі:
Ў жыцці  гэтак  часта  бывае.
Яны  сваё  шчасце  знайшлі,
Яна ж і сягоння шукае.

Маўклівым шнурочкам гады,
Яе  адлятаюць  у  неба.
І  цяжка  знайсці  брады
Ў  каханні. А мо ўжо й  не трэба?

* * *
Дзве незнаёмыя жанчыны
Сядзелі побач на вакзале.
Раптоўна неяк, без прычыны
Адна ў другой спытала:

- Прабачце, ехаць вам куды?
Хутчэй бы ўжо дадому...
Чакаць і даганяць заўжды
Не хочацца нікому.

Было няёмка прамаўчаць,
Суседцы выпадковай.
Прыйшлося сціпла адказаць.
І пацякла размова...

Спачатку пра сваіх дзяцей
Жанчыны размаўлялі,
А праз гадзіну ці пазней?
Бы птушкі, шчабяталі.

Пра тое, што іх мужыкі
Не п’юць, збіраюць грошы.
Руплівыя, не лайдакі,
Не спяць яны “ў кошык”.

- У  нас з маім даўно любоў,
Лічы, са школьнай парты.
Раўнівы ён - да сінякоў,

Дурны, у той час і ўпарты...

А ваш хіба вас не раўнуе?
Бо вельмі вы прывабна.
Мяне не любіць мой – шкадуе,
Чысцютка гэта праўда.

Размовы сэнс жаночай гэтай
Ад Евы свет хвалюе.
Што лепей? – калі муж кабету
Кахае, ці - шкадуе?..

* * *

Многія за папугая
Грошай даюць нямала.
Навучаны, ён паўтарае
За імі ўсё, што папала.

Чырвоныя, сінія ары
У клетках прыгожых сядзяць,
На жэрдачках дрэмлюць і мараць,
Што новага людзям сказаць?

За смачную ежу дармову
Ім трэба старанна крычаць.
І нават замежнаю мовай
Чужынцаў шляхетна вітаць.

Дурная, нікчэмная птушка,
Нічога з яе не прыдбаеш.
Ні яек у ежу, ні тушкі,

Дый “попкай” сябе называе.

Калісьці не кінуць арэшкаў,
У сподак вады не нальюць.
Куды ты падзенешся, Кешка?
Не усе ж папугаяў бяруць...

**Маракам – падводнікам**

Далёка ад дому і роднай краіны,
Ў глыбінях халодных, чужых,
Крадзецца нячутна, бы цень, субмарына
Намечаным курсам на слых?

Лакатары лодкі - і вочы, і вушы:
Усё чуюць і бачаць наўкруг.
Яны заглядаюць у думкі і душы?
І ловяць здалёк кожны гук.

Піхаюць падлодку грабныя вінты,
Іх круцяць старанна турбіны.
З рэактара пару глытаюць яны.
Працуе рэактар няспынна,

Дае ён на борт і цяпло, і святло,
Яго берагуць, быццам сэрца…
А што, маракі, вас з зямлі прывяло,
Сюды ў небяспечнае месца?

Вільготна ў адсеках, цяснота наўкол,
Зусім не зямное паветра.
Надзея на сябра жыве тут спакон -
Не выжыць інакш у цёмных нетрах.

У сакрэтным раёне застыне падлодка:
Дзяжурства нясе баявое.
Задраяцца шчыльна перагародкі,
Ашчэрыцца хіжная зброя.

Пасты займуць дружна ізноў маракі,
“Прыём” будзе толькі ў эфіры.
На беразе, ў Бога іх просяць, жанкі,
Паход каб закончыўся мірам.

Назад клічуць лодку сівыя прычалы,
Пачуць хочуць хвосткі равун.
І нават прыціхлі разгульныя хвалі
Сярод непрычэсаных дзюн.

Каханыя ў месцы швартоўкі стаяць:
Іх гоніць дамоў сівер-вецер -
Яны ж не адступяць і будуць чакаць
Мужчын, самых мужных у свеце.

* * *

Зямелька ў нас беднавата
І ўлетку халодныя ранкі,
Затое ў ветлівых хатах
Вясёлкай гараць вышыванкі.

Жывём мы здаўна небагата,
Ратуюць нас лес, журавіны.
Пявучыя нашы дзяўчаты,
Руплівыя ў працы мужчыны.

Хоць часта жывём цеснавата,
Бо сем’і вялікія ў нас.
Затое ў нядзельку і ў свята

Чакаем дзяцей кожны раз.

Шчабечуць, спяваюць рабяты
Ў падворках бабуль і дзядоў:
Не цягне маленькіх дахаты
У горад з вясковых дамоў.

Прачнуцца яны пазнавата
І з кубачкаў п’юць сырадой.
А потым свой тварык мурзаты
Калодзежнай мыюць вадой.

Мы свой не хаваем дастатак –
Празрыстыя нашы фіранкі...
Агнём каляровым у хатах
Смяюцца, гарацць вышыванкі.

* * *

Жоўтым полымем дубы
Палыхаюць у восень,
А ў іх – сівыя мы
Золата не просім.

Нам каб Бог здароўя даў,
Адганяў каб старасць,
Менш было нялёгкіх спраў
І сапраўднай – радасць.

Унукі хутка каб раслі,
Помнілі нас дзеці.
І яшчэ крыху змаглі
Мы пажыць на свеце.

Каб наступны кожны год

Сустракаць – у пары,
Пасля ж нас застаўся род –
Працавіты, з марай.

## З таго жыцця...

У тым жыцці хто быў царом,
А хто араў і сеяў,
Слыў нехта мужным ваяром,
А нехта – ліхадзеем.

А я, напэўна, у пушчы жыў,
Быў пчаляром заўзятым,
Кашулю тканую насіў,
Сад пасадзіў ля хаты.

Зімою жонка мая ткала
На кроснах цуды- дываны,
Дзяцей любоўна даглядала –
Раслі здаровымі яны.

Было сямёра ў нас сыноў,
Дачушкі дзве – блізняткі.
Сярод духмяных мурагоў
Гулялі нашы статкі.

Усяго хапала той сям'і,
 Найбольш свабоды, волі.
І дружна мы тады жылі –
У дастатку, з хлебам-соллю.

Чаму праз тысячу гадоў,
Ці крыху, можа, болей,
Не стаў я пчаляром ізноў,
Не буду ім ніколі?..

Шкада, што чыстае вады
Не піць з крынічкі поўнай,
І не прынесці мне сюды
Ў наш час, маёй князёўне.

* * *

Ну, поўны я, і жонка мая поўна.
І БАДы еў, і на дыеце быў -
А важу я за сто ўсё роўна
Вось каб яшчэ не менш і жыў!..

* * *

Спазнаў я абдымкі тугі,
Мне сум развітання знаёмы.
Чужыя вітаў берагі,
З якіх рваўся птушкай дадому.

Калі на Радзіму ляцеў,
Здавалася, зложацца крылы:
Стагнаў, не здаваўся, цярпеў -
Адкуль толькі браліся сілы?

А сёння з Палесскай зямлі
Гляджу з захапленнем у неба
І ведаю, што не пяклі
Нідзе, як тут, смачнага хлеба.

А з нашых празрыстых крыніц
Глыточак вадзіцы спатоліць...
Я ў госці прыеду – пакліч,
А вось назаўсёды – ніколі!

У свеце ёсць многа краін
Прыгожых, цяплейшых, багатых.
А я,  шляхам стомлены сын,
Вярнуўся ў бацькоўскую хату.

Адсюль хай душа  адляціць,
Да  зорак, пад плач завірухі.
Зямля, дзе пашчасціла жыць,
Будзь мне дыванам, будзь  і  пухам.

## З празрыстай ледзяной крыніцы

З  празрыстай  ледзяной крыніцы
Пілі  вадзіцу мы ў бары.
Ты  для  мяне  зрываў суніцы
Чырвоныя, бы снегіры.

У той час не мог  ты надзівіцца
На неба сінь  ў маіх вачах.
А  я  не здолела  спыніцца
І захмялела  ў верасах...

І гэта бачыла яліна:
Яна хавала  нас з табой.
Табе  я верыла, адзіны,
Каханы мой, жаданы  мой!

Жыве крыніца-чараўніца,
Бруіць між гладкіх камянёў.
А я даўно адна чарніцы
Рву ля знаёмых верасоў.

* * *

Снег зрыжэлы споўз у лагчыны.
На палях яго няма.
Калі йдзе вясна-дзяўчына -
Уцякай, бабка-зіма.

Забірай з сабой завеі,
Маразы, празрысты лёд.
Пакідай сабе надзею,
Што надыдзе новы год.

Ты ж, вясна, бадзёрым крокам,
Абыдзі палі, гаі.
Жыццядайным свежым сокам
Дрэвы, кветкі напаі.

Ды пакліч дзяцей на волю,
А старэнькіх - да цяпла,
Жаўрукоў - спяваць над полем
Песні-мары ля сяла.

Людзям стукні ў вокны, дзверы,
Свежым ветрам разбудзі.
Ды у прыгаршчах надзею,
Шчасце, радасць прынясі.

## Сасна упала

Сасна упала... Гэта ж трэба!
Учора тут яшчэ расла.
На лапах калыхала неба,
А сёння ранкам-адышла.

Гадоў ёй, пэуна, пяцьдзесят -
Дзявочы узрост як палічыць

Зламау шалены вецер-кат,
А дрэву жыць яшчэ ды жыць.

Драмаць уначы, шумець удзень,
Дурманіць свежаю смалою.
І на табе - застауся пень
Ды й ен зраўняецца з зямлею.

Не усім у жыцці спрыяе лёс
Каб не адна сасна стаяла,
Была ў бары, што побач рос
Яшчэ жыла б, яшчэ б не упала.

* * *

Быццам звонкай вясной ручайкі
Што бягуць усе хутчэй і хутчэй
Мы, дзяўчаты і юнакі.
Крочым дружнай сямейкай у ліцэй.

Тут нас вучаць зямельку любіць
Як араць, даглядаць трэба глебу
Як жаданых гасцей накарміць,
Іх сустрэць намі спечаным хлебам.

Нехта з нас пабудуе дамы
Атынкуе, уставіць акенцы
Працу зробім дабротную мы –
Укладзем свае душы і сэрцы.

Прыйдзе час, назаўжды адляцім,
Быццам птушкі расправіушы крылы.
Наш паклон вам, настаунікі, усім
І табе, ЛІЦЭЙ, любы і мілы.

* * *

Старэнькі дзед і конь стары
Збіраюцца ў дарогу.
Дажыўся й воз да той пары –
Ледзь круціць колы-ногі.

Кіёчак дзед з сабой не ўзяў,
Ён сёння не патрэбны.
А сена вось, каню, напхаў
У мех даўнейшы, зрэбны.

Амаль штодзень утрох яны
Кудысьці моўчкі едуць.
Іх вабяць пахам палыны,
Здалёк вітаюць дзеда.

Яму апошнія гады
Нясуць сум і гаркоту.
Вязе конь дзеда ад нуды,
Далей ад адзіноты.

* * *

Насупраць клуба, па-за брамай
Гармонік у гэты дзень не граў.
Грымела громам фанаграма
Спявак за ёй не паспяваў.

Дзяўчынкі ў джынсах танцавалі
Агністы "дыско", жвавы "твіст"
Удалоні моладзь ім пляскала
І запрашала зноў на "біс".

Бабулі між сабой шапталі
Чаму на Спас, у такое свята,
Сукенкі не паапраналі –
Льняныя, у васількі, дзяўчаты.

Вяночкі дзе ў прыгожых стужках
Кашулі ў хлопцаў, паяскі,
Дзе знікла скрыпка, бубен гулкі -
Няўжо зламаліся смыкі.

Грымела доўга фанаграма.
Замежных песень у нас багата.
Хлапчук малы пытаў у мамы:
"Спас - гэта што, канцэрт, ці свята?

# Усміхнемся разам!

## Абразанне

У халадным лістападзе
Абразаў дзядок сукі.
З ім унучак быў у садзе:
Яны з дзедам – дружбакі.

- Ты навошта абразаеш
Столькі голля з добрых дрэў?
Хіба дроў зусім не маеш
Ці пад старасць звар’яцеў?

Разгубіўся дзед… Не зразу
На пытанне адказаў:
Бачыш, як смаркач абразіў!
Драбазя, а так падцяў!

- Я, саколік мой, знішчаю
Толькі хворыя сукі,
Маладзенькіх не чапаю,
Хай растуць ва ўсе бакі!

А з старых галін, унучак,
Больш нам яблыкаў не рваць.
Нат у кніжках зараз вучаць,
Як старое прыбіраць.

Вось цяпер сам будзеш ведаць,
Як хадзіць трэба ля дрэў.
- Дзед, а што табе абрэзаць,
Каб і ты памаладзеў?

Зноў збянтэжыўся старэнькі,
З паўхвіліны соп, маўчаў…
Потым буркнуў:
- От дурненькі!

Ды калі б я тое знаў,
Дык гадоў таму пятнаццаць
Знішчыў корань той ці сук!
А цяпер давай збірацца,
Змарнаваў настрой ты, ўнук!

* * *

Бег да яе, думаў няспынна,
Каб хоць свой гонар не згубіць,
Бо будзе брыдка прад жанчынай,
Што яна просіць - не зрабіць!

Сустрэла, кажа мне: "Нарэшце...
Калі прыйшоў, дык не дрыжы,
Падсунься, каб хапіла месца…
Расслабся, ты ж не на крыжы!.."

"Маўчы, не трэба, каб пачулі,
Што буду я рабіць з табой.
І ведай, тут табе не гулі –
Не менш гадзіны будзеш мой!"

Ў мяне ссінелі раптам губы,
Ад слоў яе скрывіла рот,
Заляскаталі дробна зубы,
Я зразумеў: папаўся, кот.

А потым... Што яна рабіла!..
Круціўся я бы той мянтуз.
Яна мяне ўсё хваліла:

“Крышку яшчэ... мужчынай  будзь!..”

Назад ішоў - дрыжалі ногі,
Быў мокрым, мяккім, быццам квач.
...Як добра, што зубоў не многа
Лячыла мне жанчына-ўрач.

## Як вепрука свежавалі

«Міхась, — сказала гаспадыня, -
- Вяпрук наш сыты, не ўстае.
Мукі не надта многа ў скрыні,
І новы год вунь настае».

«Калі калоць, дык я ў нядзелю
Антося з Федзем папрашу,
Бо ты ўжо надта надаела,
Ніяк табе не дагаджу.

Глядзі, каб нам падрыхтавала
Кубелец, посуд для крыві.
Гарэлкі каб не шкадавала».
«От, хлопцам хопіць, ты ж — не пі.

Бо летась — зноў каб не сурочыць –
Балён гарэлкі «пакацілі»,
Мне не падмог і я да ночы
Усё адна" тады рабіла».

«Ну перастань. Чаго прыстала?
Яшчэ вяпрук стаіць у хляве,
А ты мяне ўжо знервавала!
Адкуль той чорт у табе жыве?»

«Глядзі, Міхась, каб усё добра
На гэты раз нам абышлося.
Фядос слабы і вельмі дробны...»
«А мы нашто тады з Антосем?»

Прабеглі дні, і хлопцы зранку
Удвух да хаты тупацяць.
Міхась чакае іх на ганку.
«Ну, што? Пайшлі мо пачынаць?”

Не, лепш пакліч нам гаспадыню,
Пры ёй спрытней будзе вязаць.
Як што, дык мы яго зачынім,
Няма куды яму ўцякаць».

Праз мо няпоўнай паўгадзіны
Вяпрук на снезе ўжо ляжаў,
Мужчыны црагна закурылі,
“Ты бачыш, нават не вішчаў”.

«Ну, а цяпер давайце разам
Асмалім хутка мы яго.
Зручна смаліць з балона газам,
Саломай жа было — ого!»

Дзе ж мая жонка, хай жа грэе
Ваду хутчэй у варыўні.
- Нас не гані – яшчэ паспеем
- Прысядзь ля нас, крыху сапні.

Вадой гарачай ды анучай,
Нажамі добра паскраблі,
Яшчэ знялі з яго «абутак»
І паднялі на шчыт з зямлі.

Далей была Антосю справа :

Нажом свінчо перахрысціў.
І вельмі хутка, вельмі спраўна
Усё разабраў ды разлажыў.

Паклалі свежыну ў сенцах.
У хаце пах, нешта скварчыць,
А жонка — ў чысценькай сукенцы,
І на стале балён блішчыць.

«Сядайце, хлопцы, калі ласка,
Ну што, Міхась, мо налівай?
Вось тут пячонка, вось і мяска,
Ты не глядзі, Антось, давай».

Антось кілішак першым кінуў.
За ім Міхась, затым Фядос.
Крыху глынула гаспадыня,
Бо ёй рабіць, яна — не госць.

Звінелі шклянкі доўга ў хаце.
Балён «раскінулі» на трох.
Міхась, як летась, розум страціў
І зноў, кабеце, не падмог.

## «АЛІМПІЯДА»

Нейк улетку пасля працы
Вырашылі мужыкі
Адпачыць, вінам “размяцца”
Ды пахрумкаць агуркі.

Пайшлі з працы па закону -
На часах было ўжо пяць.
Рушылі да стадыёна:
Зручна там адпачываць.

На траве, ля самай вежы,
Тое, скуль цячэ вада,
Разлажылі пляшкі, ежу –
Загуляла грамада.

Пілі дружна, быццам гусі,
Гаманілі, як ім жыць,
Што начальства, пэўна, мусіць
Болей грошай ім плаціць.

Бы ручай, цякла размова,
Потым нехта з іх сказаў:
"Хопіць, хлопцы, а ні слова –
Стадыён для іншых спраў!

Вырашым, хто з нас дужэйшы
На руку ці ў барацьбе.
А пачнём з тых, хто лягчэйшы.
Не глядзі, Міхась, з цябе".

Віктар усіх адолеў хутка,
Пакаціў, схіліў усім рукі.
Быў другім Міхась - ён пруткі.
Слава ж піў і толькі нукаў:

"Ну, давай, яшчэ па крыху,
Ну, куды падзеўся сыр..."
Потым сціх і толькі хмыкаў,
Рохкаў, бы ў спякоту кныр.

Пры канцы Васіль і кажа:
"Барацьбу пачнём мы зноўку,
Хай цяпер Віцёк  пакажа,
Як адолець стомятроўку".

Стартавалі  толькі двое,
Трое нават не пайшлі,
А дабегчы Мішка здолеў,
Віцьку ногі падвялі.

Што рабілі хлопцы потым –
З іх не ведае ніхто,
Бо пакінулі ля плота
І закуску, і пітво.

Доўга потым ад народа
Чулі байкі мужыкі,
Як ім дома “узнагароды”
Раздавалі іх жанкі.

**Байка пра кумпяк**

Вісеў кумпяк, прыгожы і чырвоны,
З вясны ў адзіноце на гары.
Ён быў духмяны і салёны,
Аднак сярдзіты, што не на двары.

Нудзіўся кроквам, што не паважаюць –
Хіба ён горш грудзіны ці хрыбта?
Чаму яго старанна так хаваюць,
Як куранят маленькіх ад ката?

Маўчалі кроквы, многа дзён цярпелі,
Ажно смалою плакалі сукі.
І трэба ж так, што неяк прыглядзелі
Вось гэту смакачэчу пацукі.

Зладзюгі тыя ўсё зрабілі проста,
Кумпяк пайшоў імгненна “на ўра”,

А на вяроўцы засталася костка
Нікчэмнай рэштай для гаспадара.

Калі ты родам з кумпякоў,
Будзь пільным кожную хвіліну,
Бо многа сквапных пацукоў
Палюе на дармовую вяндліну.

**Матрыярхат**

Аднойчы  неяк я прысніў,
Што зноў прыйшоў матрыярхат.
Наш прэзідэнт жанчынай быў,
Жаночы засядаў урад.

Ды быццам летам мужыкі
Стаяць, нагнуўшыся ў разорах,
І з песняй полюць буракі,
Сякуць зямлю з-за вуха “хорам”.

Жанчын няма — бо на футболе:
Ганяе мячык слабы пол.
Напрацаваліся... Даволі...
Крычаць з трыбуны гучна: «Го-о-о-л!»

Дзядкі ўсе па магазінах,
Бо трэба сем'і накарміць,
Харчы нясуць на кволых спінах,
Няма калі «казла забіць».

Лагодна, ціха ў кожнай хаце,
Гарэлкі мужыкі не п'юць.
Як вып'еш пры такой зарплаце?
Дадому грошы ўсе нясуць.

Бягуць мужчыны з працы рана:
Стараюцца, каб хоць паспець
З канапы на тэлеэкране
Усе серыялы паглядзець.

Цішком крадуцца пакурыць
«Карону» ці смярдзючку «Прыму».
І трэба гэта так зрабіць,
Каб не запахла ў хаце дымам.

А потым сню, што у дзяружцы
Нясу духмяную траву:
Пакуль сярпом нажаў цялушцы,
Руку апёк аб крапіву.

У слязах прачнуўся - вельмі рады,
Што гэта я  толькі прысніў,
Навошта нам матрыярхаты?
Няхай жывем так. хто як жыў.

**Клон**

Сустрэліся Іван з Лявонам,
Каб аб жыцці пагаманіць,
Размову пачалі пра клоны,
Што ў серыяле сталі жыць.

- Лявон, табе я пабажуся,
Што гэты фільм мяне не ўразіў:
Два дурні там — Саід і Лукас –
Аж душацца з-за бабы Жадзі.

Таго Саіда нехта спудзіў,
Бо як ён мог вось так аддаць –
За Жадзі ажно пяць вярблюдаў,

Каб толькі ў жонкі яе ўзяць!

- А я, Іван, стаў слепаваты
І гэта  глупства не гляджу.
Як «Клон» ідзе,  уцякаю з хаты,
Лепш па падворку пахаджу.

Дый там чуваць мне жонкі лямант:
“Як многа золата ў іх,
А хустак! Не злічыць і нават
Да смерці не знасіць усіх”.

І кожну ночку ў вочы лезе,
Аж да вантробаў дастае,
Усё нешта хоча мне абрэзаць,
Але не кажа што і дзе.

Раней шаптала: «Мой ты перчык,
Ну чым цябе пачаставаць».
А зараз кліча мяне Леўчык.
Бы цюцьку. Трэба ж так назваць!

Лявон, дык гэта шчэ нічога,
Махні рукой, на ўсё начхай.
Мая ж, каб не пакрыўдзіць Бога,
Мяне рыхтуе, мабыць, у рай.

Што не раблю — “Не так,  не трэба”.
Каб на суседак не глядзеў.
Мне не дае адрэзаць хлеба,
Крычыць, каб адламаны еў.

Ды стала жонка мацюкацца,
Усё кажа на мяне «Харам»*.
А што гэта — не разабрацца:
Ці йсці куды, ці ў вуха дам!?

Сцямнела. Ліўся свет з акон,
Дзядзькі не рваліся дамоў:
Калі глядзяць жанчыны «Клон», -
Не да сваіх ім мужыкоў.

## Баравікі

- Пятрусь, ты чуў, казалі людзі,
Пайшлі вакол баравікі.
А ты ўсё нейку дробязь вудзіш,
Сядзіш, бы чапля, ля ракі.

Дык заўтра прыцемкам з табою
Бярэм па лусце і кашы,
У бары за Лысаю гарою
Грыбоў расце - касой касі.

“Харам” - грэх
Адно глядзі, каб ані слова
Суседцы нашай не казаў,
Як што, хлусі  ідзем па дровы,
Сабаку каб з сабой не браў.

Чуваць далёка ў лесе рэха,
А ён жа летась нас «прадаў».
Прывалаклася ж гэта Стэфа,
Калі дурны твой Бакс брахаў.

Яна ў той дзень перада мною
Прайшла, як трактар бараной.
Бы дзік лычом пад кожнай хвояй
Усё разграбла, а ліха ж ёй.

Грыбоў набрала ў фартух,

Бо ў кош яе ўсе не ўлезлі.
Мы менш нарэзалі на двух,
Хоць як маглі са скуры лезлі.

На  досвітку Пятрусь з Марусяй
Прыйшлі да Лысае гары,
Схілілі голавы, бы гусі,
І пачалі збіраць грыбы.

А тут грыбоў было нямала
І большасць з іх - баравікі,
Калі па паўкаша набралі,
Пачулі, што трашчаць сукі.

Пятрусь, здаецца, з глузду з'ехаў,
Аж спатыкнуўся і ўпаў,
Здалёк яго спытала Стэфа:
“ Чаму ж ты Баксіка не ўзяў?»

## Пад каштанам

У вёсцы Нача  пад каштанам,
Калі  пеўні  яшчэ спяць,
Мужыкова  “рада” рана
Пачынае засядаць.

Павітаюцца спачатку,
Пералічаць усіх “байцоў”,
Потым лёгкім “фіззарадка” –
Травяць дымам камароў.

Кожны  тут аўтарытэт –
Вёсцы   шмат гадоў аддаў.
А  Анцёк Свірыд - паэт,
Вершы нават друкаваў.

Усе маўчаць, і раптам слова
Нехта кіне проста так,
Успыхне полымем размова:
Дзе, каму, за што і як?

Пра палітыку “Гамулка”
Растлумачыць слухачам:
У яго язык не мулкі,
Рэжа так, як быў сам там.

З раніцы “хварэюць” хлопцы:
Не дае ім жыць “сушняк”.
Да васьмі, ну хоць ты лопні,
Не падлечышся ніяк.

А калі званок у краме
Прывітальна зазвініць,
Мужыкі гуртом рахманым
Пабягуць пітво набыць.

Тры цукеркі і дзве пляшкі -
Вось і ўсё што змаглі ўзяць.
І з віном, бы гусі, важка
Крочаць “ў ліпкі” баляваць.

- Будзьмо, - скажуць, больш - ні слова.
Што яшчэ ў наш час жадаць?
З чаркі дзень пачнецца новы,
Ну, а потым, - што Бог дасць.

Дасць не дасць, назаўтра рана
Будзе “рада” вырашаць.
У вёсцы Нача, пад каштанам:
Дзе, за што, і колькі ўзяць?..

## Дранікі

Цішком, у нядзельку, раненька,
Калі “мая” пад коўдрай спіць,
Рыхтую я на кухні дранікі,
Каб жонку смачным накарміць.

Спачатку добрай бульбы місу
Пачышчу і ў вадзе памыю,
А потым тру яе пакрысе,
Бы журавель, сагнуўшы шыю.

Націсну ў цеста я цыбулькі,
Ды часнаку аж два зубкі,
Падсыплю соды паўграмулькі,
Яйцо ўваб’ю, сыпну мукі.

Дабаўлю солі і   алею,
Каб дранікі не падгаралі.
Патэльню хораша прагрэю –
Блінцы каб лёгка адставалі.

Далей жа “нарыхтоўку” лыжкай
Хвілінак некалькі мяшаю.
Затым  пяку, і тыя пышкі
Лапаткай спрытненька здымаю.

Як застанецца цеста жменька,
Галёкаю сваёй: “Уставай!
Ідзі паснедаем, паненка,
Сама смятану налівай”.

Бываюць розныя прысмакі,
А лепш няма, чым дранікі.
Салодзіць сэрца жонка: “Дзякуй!”-
Нядзелькай божай раненька.

## Пра бочку

З суседам нашы гаражы
Стаяць, як два грыбочкі.
Прашу яго: “Дапамажы,
Давай прыладзім бочку!

Рыдлёўкі возьмем, ты і я -
Хіба мы не мужчыны?
Вадзіца будзе ў нас свая
Са стрэх, каб мыць машыны”.

А ён ўсё нэндзіць: “ У Машуках
Тых бочак маю многа,
Дык не нясці ж мне іх у руках
Адтуль - кусок дарогі”.

Здаецца, больш я не сцярплю:
Вазьму балён “замочкі”
І сам у іншага куплю,
Сабе цыстэрну-бочку!

У дождж мо тоны паўтары
Вады ў яе нальецца.
Папросіць хто, скажу: “Бяры! -
Суседу ж - дулю з перцам!

## Дыялог

-Набраўся зноў, як жаба мулу,
Ну, пакажы, ці што прынёс.
Сам пагуляў, а жонцы – дулю?
Каб чорт цябе да ранку трос!

Сусед і вып’е, і цукерак
Заўсёды прынясе дамоў.
У цябе ад іх няма й паперак.
Усе цягнеш да сваіх сяброў.

Наш кот і той хоць раз у тыдзень,
Як зловіць мыш, дык мне нясе.
Ну, прызнавайся, стары злыдзень,
Зноў грошы “прасадзіў” усе?!

Чаго маўчыш? Скажы хоць слова,
Бо не ўтрымаюся - заб’ю!
Няўжо прапіў ты нават мову?
- Ну, дзе табе я мыш злаўлю?..

**Пятровіч**

Пятровіч кожны дзень хадзіў
У халаце чыстым, белым.
У кішэні валідол насіў,
Нахабным быў і смелым.

Любіў усім ён расказаць
Пра справы ў медыцыне.
Казаў, што лепей папрымаць,
Калі ў вас шкарлятына.

Палохаў, што ў апошні час
Вакол пайшлі інфаркты.
І быццам з поўначы да нас
СНІД прывязлі на нартах.

Пляткарыў пра шызафрэнію,
Якая з Афрыкі ідзе.
І ад яе нібы жывая
Не ўратуемся нідзе.

Яшчэ Пятровіч павучаў,
Які сакрэт залозаў.
А сам - у бальніцы працаваў

Ўсяго толькі - “завхозам”.

## Пазыка

- Здароў, сусед, ну, што, трашчыць?
- Трашчыць, а каб яно згарэла
- Прасіў цябе – даволі піць,
А ты: - гуляем – панядзелак!

Ці помніш хоць, за што пілі,
І колькі мы напазычалі.
І песні гучна, як “раўлі”
Калі па вёсцы “вышывалі”?

- Чакай, а хто нам пазычаў?
- Хіба не помніш колькі бралі?
Язэп на дзень пазыку даў,
На вэксэль ў краме запісалі.

- Пабач і Зоня вунь ідзе:
Пэўна забраць хоча пяцёрку.
- Ну, ўсё, мяне мая заб’е,
Як паляўнічы той цяцёрку.

А як я з ёй дагаварыўся?
У яе зімою снег не ўзяць.
- Ты ж прэзідэнтам пабажыўся
І кляўся з раніцы аддаць.

- Уцякаем, брат, з табою хутка,
Бяжым у розныя бакі.
Калі мая выйдзе Анютка
Нават не каркнем, бы гракі…

У яе рука - цяжэй бязмена.

Сама ж як глянеш - хэрувім.
Заб’е мяне як цвік у сцену:
- Чаго сядзіш карчом – бяжым!

Сустрэліся сябры ля крамы
І зноўку сталі разважаць,
Каб падлячыцца, на 100 грамаў.
Дзе ім яшчэ пазыку ўзяць.

*Вас усіх я запрашаю*
*Пад гармонік танцаваць.*
*Хай ніхто не замінае*
*Нам прыпевачкі спяваць.*

У мужыкоў нашых загана:
Самагонку хвошчуць,
Сінія, бы баклажаны,
І жанок не “топчуць”.

Урачоў трэба  шкадаваць,
Бо ім плоцяць мала.
Едзьце ў вёску працаваць –
Будуць яйкі з салам.

Збудавалі нам дамы –
Чорт не пазайдросціць.
Ў іх, як жабы, мерзнем мы,
Летам  стынуць косці.

Быццам філін на суку,
Нехта стогне, вые,
Гэта зяцю–прымаку
Цешча шыю мые.

Каб зяць цешчу шанаваў,
Шараваў ёй пяткі,
Дык даўно б сабе прыдбаў
“Мэрс” ці хоць “дзевятку”.

Цесць з зяцьком гарэлку п’юць
З раніцы у хаце:
З першай чарачкі клянуць
Цешчу  з  яе  маці…

Спевакам чамусьці веру
Слёзы нават коцяцца,
А яны гоняць "фанеру"
Ім спяваць не хочацца.

Рот ледзь могуць раскрываць
Зоркі ганарлівыя,
Вось каб ім за гэта даць
Грошыкі фальшывыя.

Хай пабачаць, ці дадуць
За іх лусту хлеба.
Не дадуць дык запяюць
Без хлусні – як трэба.

Калі што – прабачце нас:
Людзі мы вясковыя.
Вам прыпеўкі ў другі раз
Праспяваем новыя.

**Беларусь мая, родная, мілая...**
***Зборнік вершаў падрыхтаваны раённай дзіцячай бібліятэкай.***
***Рэдактары: Н.І. Лойка,***
***С.А. Локтыш***
***Складанне, камп'ютэрны набор:***
***С.В. Івановіч,***
***Н.В. Наумік***

***г.Ганцавічы, 2008г.***